# Данута Бічэль



О матчына мова! Маленства вясна!
Ніколі ніхто мне цябе не заменіць,
Бо ты, як і маці, на свеце адна.

*Алесь Бачыла.*

## РОДНАЕ СЛОВА

Пад казачным дубам над Нёманам сінім
хлапец прызнаваўся ў каханні дзяўчыне.
І рэхам той шэпт адгукаўся між гаю:
— Кахаю... кахаю... кахаю... кахаю...

Я чула пяшчотнае, шчырасці поўнае,
маё, беларускае, роднае, кроўнае...
такое сваё і такое чароўнае.
Такое ласкавае, цёплае, чыстае,
як сонца, агністае, як Нёман, празрыстае,
бы казка, быліна, бы песня, жаданае,
дагэтуль зусім у жыцці не спазнанае,
вясновае слова ад шчырага сэрца.
Яно празвінела над хвалямі ў рэчцы.
Вятрыска шаптаў яго з лісцем між гаю —
кахаю, кахаю... кахаю, кахаю...
Шапталі яго сенажаць і дуброва —
людзьмі перачутае, некаму нова,
адзінае, дзіўнае, светлае слова...

Кахаю... Люблю...
Беларускаму краю
бясконца я слова «люблю» паўтараю.
Калоссям жытнёвым, зялёнай дуброве
кажу гэта слова на матчынай мове.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Якімі эмоцыямі і пачуццямі пранізаны верш?
2. Вызначце тэму верша. Звярніце ўвагу на тое, як па-асабліваму, з дапамогай двух асноўных мастацкіх сродкаў — параўнання, метафары — раскрываецца яна ў творы. Назавіце іх.
3. Знайдзіце ў вершы радкі, у якіх характарызуецца роднае слова. Праз якія эпітэты аўтар паказаў свае адносіны да матчынай мовы? Зачытайце іх з адпаведнай інтанацыяй (спакойна-апавядальнай, усхваляванай, замілаванай, урачыстай ці якой іншай).
4. Як уплывае на гучанне верша рыфма? Звярніце ўвагу на паўтарэнне галосных гукаў [о], [а] ў словах, якія рыфмуюцца. Вызначце вершаваны памер.
5. У вершы некалькі разоў паўтараецца радок «Кахаю... кахаю... кахаю... кахаю...». Што нагадвае вам гучанне гэтага паўтору?
6. Узнавіце радкі — прызнанне ў любові да роднага краю (трэнажор па вершы Дануты Бічэль «Роднае слова»).

Кожны з нас не аднойчы задумваўся над тым, калі ўжываць у сваім маўленні словы «кахаць» і «любіць». Якое з гэтых слоў і калі выкарыстоўваць? Гэтыя словы, здавалася б, такія блізкія па значэнні, маюць даволі істотнае адрозненне.

Слова «кахаць» у сучаснай беларускай мове мае больш вузкі аб'ём значэння. Кахаць — мець вялікае сардэчнае пачуццё да асобы іншага полу. Такім чынам, кахаюць дзяўчыну, хлопца, нявесту, жаніха, жонку, мужа. А вось сваіх родных і блізкіх — маці, бацьку, братоў і сясцёр, бабулю, дзядулю, сяброў, настаўнікаў і іншых — любяць, як і любяць прыроду, Радзіму, музыку, цукеркі і г. д.

Дарэчы будзе ўзгадаць радкі з верша пісьменніка Сяргея Грахоўскага, якія пакінуў нам паэтычны ўзор адрознення слоў «любіць» і «кахаць»:

...Люблю маладых  
І люблю пасівелых,  
Вясёлых люблю,  
А кахаю адну.



Правообладатель Национальный институт образования